Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____________ А.В.Макоўчык
____ 06. ________ 2019 г.
Рэгістрацыйны № УД-27-3-№10-2019/вуч.

# МАДЭЛІ ФАРМІРАВАННЯ БІЛІНГВАЛЬНАЙ МОЎНАЙ АСОБЫ МАЛОДШАГА ШКОЛЬНІКА

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:**

1-08 80 02 Тэорыя і методыка навучання і выхавання
(па галінах і ўзроўнях адукацыі).
Прафілізацыя: Пачатковая адукацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2019 г.

Вучэбная праграма складена ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам II ступені вышэйшай адукацыі ОСВО ____________________ і тыпавым вучэбным планам В 08-2-002/пр-тип. па спецыяльнасці 1-08 80 02 Тэорыя і методыка навучання і выхавання (па галінах і ўзроўнях адукацыі). Прафілізацыя: Пачатковая адукацыя, зацверджаным 21.03.2019.

**СКЛАДАЛЬНІК:**
Свірыдзенка В.І., дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
Цірынава В.І., вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі пачатковай адукацыі навукова-метадычнай установы "Нацыянальны інстытут адукацыі" Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
Дзятко Д.В., загадчык кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай беларускага і рускага мовазнаўства ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка" (пратакол № 10 ад 21.05.2019).

Загадчык кафедры
_______________ А.С.Васілеўская

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка" (пратакол № 6 ад 18.06.19 г.).

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальнага матэрыялу дзею.чым патрабаваннямі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст аддзела магістратуры
_________________________ Т.В. Сірунова

Директор библиотеки
Н.П. Сятковская

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Працэс моўнай адукацыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі накіраваны на фарміраванне высокаадукаванай, высокакультурнай асобы, якая арганічна інтэгравана ў культуру народа, свядома і крытычна ўспрымае пачутае, асэнсавана чытае, правільна піша, свабодна гаворыць, выкарыстоўвае моўныя сродкі ў маўленчай дзейнасці ў адпаведнасці са сваім індывідуальным развіццём, усведамляе моўныя з'явы і заканамернасці, валодае маўленчай этыкай і праяўляе творчыя здольнасці. У сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя, якое мае месца ў Рэспубліцы Беларусь, узнікае праблема фарміравання білінгвальнай асобы, якая валодае і карыстаецца абедзвюма мовамі у аднолькавай меры свабодна. Менавіта таму вывучэнне шляхоў фарміравання білінгвальнай моўнай асобы малодшага школьніка з'яўляецца неабходнай умовай паспяховай падрыхтоўкі магістра ў галіне пачатковай адукацыі. Вучэбная дысцыпліна "Мадэлі фарміравання білінгвальнай моўнай асобы малодшага школьніка" заклікана ўзбагаціць студэнтаў II ступені вышэйшай адукацыі сістэмай ведаў пра асаблівасці, прынцыпы, метады фарміравання дзіцячага білінгвізму, а таксама выпрацаваць у іх практычныя ўменні, неабходныя для рэалізацыі стратэгіі фарміравання білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў на ўроках па вучэбных прадметах "Русский язык", "Беларуская мова", "Литературное чтение", "Літаратурнае чытанне".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны**

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – павышэнне ўзроўню тэарэтычнай і прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў II ступені вышэйшай адукацыі шляхам фарміравання ўменняў праектаваць адукацыйны працэс, накіраваны на развіццё білінгвальнай моўнай асобы малодшага школьніка.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

- пазнаёміць з унутранымі і знешнія фактарамі, прынцыпамі і метадамі фарміравання білінгвізму;
- сфарміраваць уяўленні пра розныя спосабы мадэлявання асобы навучэнца пачатковых класаў ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя;
- вучыць рэалізоўваць стратэгію фарміравання білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў на ўроках па вучэбных прадметах "Русский язык", "Беларуская мова", "Литературное чтение", "Літаратурнае чытанне".

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста адпаведнага профілю, сувязь з іншымі вучэбнымі дысцплінамі**

Вучэбная дысцыпліна “Мадэлі фарміравання білінгвальнай моўнай асобы малодшага школьніка” паглыбляе, абагульняе і сістэматызуе веды студэнтаў II ступені вышэйшай адукацыі, атрыманыя на I ступені вышэйшай адукацыі пры вывучэнні вучэбных дысцыплін “Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання”, “Методика преподавания русского языка и литературного чтения”. Яна мае тэарэтычна-практычны характар: акрамя знаёмства з асноўнымі тэарэтычнымі паняццямі, прадугледжана выпрацоўка ў студэнтаў другой ступені вышэйшай адукацыі практычных навыкаў фарміравання білінгвальнай моўнай асобы навучэнца пачатковых класаў пры асваенні адукацыйных праграм па вучэбных прадметах “Русский язык”, “Беларуская мова”, “Литературное чтение”, “Літаратурнае чытанне”.

Вучэбная дысцыпліна цесна звязана з іншымі курсамі – “Праектаванне інавацыйнага адукацыйнага асяроддзя”, “Праектаванне адаптыўнага адукацыйнага асярддзя / Праектаванне полікультурнага адукацыйнага асяроддзя”.

**Патрабаванні да асваення вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам**

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Мадэлі фарміравання білінгвальнай моўнай асобы малодшага школьніка” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў II ступені вышэйшай адукацыі спецыяльных кампетэнцый.

СК-6 Умець праектаваць адукацыйны працэс у адпаведнасці з сучаснымі навуковымі дасягненнямі, накіраваны на развіццё білінгвальнай моўнай асобы малодшага школьніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт II ступені вышэйшай адукацыі павінен *ведаць*:

- асаблівасці праектавання працэсу білінгвальнай моўнай адукацыі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі;
- унутраныя і знешнія фактары, прынцыпы і метады фарміравання білінгвізму, асаблівасці дзіцячага білінгвізму ў Рэспубліцы Беларусь.

У працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт II ступені вышэйшай адукацыі павінен *умець*:

- рэалізоўваць стратэгію фарміравання білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя;
- праектаваць метадычнае суправаджэнне працэсу моўнай адукацыі з апорай на розныя мадэлі фарміравання білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў.

У працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт ІІ ступені вышэйшай адукацыі павінен *валодаць*:

- навыкамі распрацоўкі сістэмы вучэбна-пазнаваўчых задач, накіраваных на знаёмства навучэнцаў з моўнымі адзінкамі, асаблівасцямі іх функцыянавання ў маўленні, культурнай інфармацыяй, заключанай у іх;
- навыкамі распрацоўкі сістэмы вучэбна-практычных задач, накіраваных на выпрацоўку індывідуальных здольнасцей вучняў арыентавацца ва ўмовах зносін, планаваць маўленчую дзейнасць і кантраляваць развіццё камунікацыі ў цэлым і сваёй дзейнасці ў прыватнасці.

**Агульная колькасць гадзін і колькасць аўдыторных гадзін, што адводзяцца на вывучэнне дысцыпліны ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам**

Праграма вучэбнай дысцыпліны разлічана на 90 вучэбных гадзін, з якіх 36 аўдыторных для дзённай формы атрымання адукацыі, у тым ліку 16 лекцыйных і 20 практычных. На самастойную работу адводзіцца 54 гадзіны. Форма кантролю – экзамен.

Для завочнай формы атрымання адукацыі адводзіцца 4 г. лекцыйныя і 4 г. практычныя, 82 г. – самастойная работа; форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## 1. Білінгвізм і білінгвальнасць. Унутраныя і знешнія фактары фарміравання білінгвізму

Білінгвізм і білінгвальнасць. Білінгвальнасць як псіхалінгвістычная характарыстыка двухмоўнага індывіда. Якасная і колькасная характарыстыкі білінгвізму.

Унутраныя фактары, што вызначаюць спецыфіку двухмоўя (псіхічныя працэсы, уласцівыя ўсім людзям, што авалодваюць мовай і належаць да пэўных узроставых груп; індывідуальныя асаблівасці суб’екта білінгвізму).

Знешнія фактары, што вызначаюць спецыфіку духмоўя (сацыяльныя ўмовы фарміравання білінгвізму; сітуацыі авалодання і карыстання мовай).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 2. Тыпы дзіцячага білінгвізму. Асаблівасці дзіцячага білінгвізму ў Рэспубліцы Беларусь

Крытэрыі выяўлення тыпаў дзіцячага білінгвізму: кампетэнцыя, камунікатыўная актыўнасць, форма мовы, узрост, спосаб і свядомасць фарміравання білінгвізму, этналінгвістычны крытэрый, прэстыжнасць і ступень роднасці моў, характар моўных кантактаў і характар ўзаемадзеяння моўных сістэм у свядомасці білінгва.

Улік крытэрыю білінгвальнай кампетэнцыі пры размежаванні збалансаванага і незбалансаванага дзіцячага білінгвізму. Улік крытэрыю камунікатыўнай актыўнасці пры размежаванні актыўнага і пасіўнага білінгвізму. Крытэрыі вылучэння прадуктыўнага, рэпрадуктыўнага і рэцэптыўнага білінгвізму. Улік спосабу фарміравання пры адрозненні натуральнага і штучнага білінгвізму. Улік свядомасці фарміравання пры вылучэнні стыхійнага і свядомага білінгвізму. Улік крытэрыю прэстыжнасці (сацыяпсіхалінгвістычная характарыстыка) пры адрозніванні адытыўнага і субтрактыўнага білінгвізму. Улік этнічнага складу сям’і і грамадсва пры вылучэнні біэтнічнага і монаэтнічнага білінгвізму. Улік сацыялінгвістычнага крытэрыю ступені роднасці дзвюх моў пры размежаванні блізкароднаснага і неблізкароднаснага білінгвізму. Улік характару моўных кантактаў пры вылучэнні кантактнага і некантактнага дзіцячага білінгвізму. Улік характару ўзаемадзеяння моўных сістэм у свядомасці індывіда пры вылучэнні змешанага (кардынатыўнага і субардынатыўнага) і чыстага тыпаў білінгвізму. Асноўныя характарыстыкі білінгвізму малодшых школьнікаў у Рэспубліцы Беларусь.

### 3. Прынцыпы і метады фарміравання дзіцячага білінгвізму

Прынцып “адзін чалавек – адна мова” (схемы і варыянты рэалізацыі). Лакальны прынцып (“адна сітуацыя – адна мова”, “адна краіна – адна мова”). Тэмпаральны прынцып (чаргаванне моў навучання на працягу дня, праз тыдзень, праз месяц). Прадметна-тэматычны прынцып (вывучэнне некаторых школьных прадметаў на роднай мове, а астатніх – на другой). Прынцып “пабочнага слухача”. Сумяшчэнне прынцыпаў. Метады білінгвальнага выхавання. Бацькоўскія стратэгіі і стратэгіі дзяцей у засваенні моў.

### 4. Мадэлі моўнай асобы навучэнца пачатковых класаў ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя

Змест паняцця “моўная асоба”. Разнастайнасць уяўленняў пра моўную асобу: мадэль сукупнай маўленчай дзейнасці групы асоб і моўны партрэт; калектыўная і індывідуальная моўная асоба; групавая моўная асоба; тыпавая і індывідуальная моўная асоба, білінгвальная асоба. Мадэляванне моўнай асобы ў псіхалінгвістыцы, сацыялінгвістыцы, лінгвадыдактыцы. Псіхалінгвістычная мадэль моўнай асобы Ю М. Караулава. Сацыялінгвістычная мадэль структуры моўнай асобы Л. П. Крысіна. Лінгвадыдактычная мадэль моўнай асобы Г. І. Богіна. Абагульненая мадэль білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў. Моўны партрэт білінгвальнай асобы навучэнца.

### 5. Стратэгія фарміравання білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя

Стратэгічная мэта моўнай адукацыі. Падыходы да выкладання мовы, прынцыпы навучання, метады і сродкі фарміравання моўнай, маўленча-камунікатыўнай, сацыякультурнай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў на кожнай з дзвюх дзяржаўных моў. Фарміраванне моўнага, камунікатыўнага, этычнага і эстэтычнага кампанентаў культуры маўлення навучэнца-білінгва. Сістэма вучэбна-пазнаваўчых задач, накіраваных на знаёмства навучэнцаў з моўнымі адзінкамі, асаблівасцямі іх функцыянавання ў маўленні, культурнай інфармацыяй, заключанай у іх. Сістэма вучэбна-практычных задач, накіраваных на выпрацоўку індывідуальных здольнасцей вучняў арыентавацца ва ўмовах зносін, планаваць маўленчую дзейнасць і кантраляваць развіццё камунікацыі ў цэлым і сваёй дзейнасці ў прыватнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**6. Фарміраванне моўнай кампетэнцыі навучэнца-білінгва пры асваенні адукацыйных праграм па вучэбных прадметах “Русский язык”, “Беларуская мова”, “Литературное чтение”, “Літаратурнае чытанне”**

Змест моўнай кампетэнцыі навучэнца пачатковых класаў на кожнай з дзвюх дзяржаўных моў. Засваенне дэкларатыўных ведаў. Выпрацоўка стратэгій авалодання другой мовай (завучванне, імітацыя, спрашчэнне, праверка гіпотэз, аўтаматызацыя новых ведаў у ходзе практычнай дзейнасці). Адхіленні ад нормы ў маўленні білінгваў. Тыпы памылак у маўленні дзяцей-білінгваў. Шляхі вывучэнння інтэрферэнцыі ў маўленні навучэнцаў-білінгваў. Праца па папярэджанні і выпраўленні інтэрферэнцыйных памылак навучэнцаў-білінгваў.

**7. Фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнца-білінгва пры асваенні адукацыйных праграм па вучэбных прадметах “Русский язык”, “Беларуская мова”, “Литературное чтение”, “Літаратурнае чытанне”**

Змест маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнца пачатковых класаў на кожнай з дзвюх дзяржаўных моў. Выпрацоўка стратэгій карыстання мовай пры гаварэнні (планаванне і карэкціраванне выказвання, рэдуцыраванне першапачатковага плана выказвання і дасягненне мэты). Выпрацоўка стратэгій карыстання мовай пры ўспрыманні і разуменні паведамлення падчас слухання і чытання (спрашчэнне і апора на вядомае). Асваенне навучэнцамі пачатковых класаў механізму стварэння пісьмовага тэксту (вылучэнне прэдыката выказвання, планаванне будучага выказвання, адбор сэнсава-лагічнага і лексіка-граматычнага забеспячэння выказвання, пісьмовая арганізацыя унутраных сувязей сказаў у тэксце, кантроль за вынікам дзейнасці). Сістэма камунікатыўных практыкаванняў (рэспансіўныя, сітуатыўныя, рэпрадуктыўныя, апісальныя, дыскусійныя, кампазіцыйныя, ініцыятыўныя) для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнца-білінгва.

**8. Фарміраванне сацыякультурнай кампетэнцыі навучэнца-білінгва пры асваенні адукацыйных праграм па вучэбных прадметах “Русский язык”, “Беларуская мова”, “Литературное чтение”, “Літаратурнае чытанне”**

Змест сацыякультурнай кампетэнцыі навучэнца пачатковых класаў на кожнай з дзвюх дзяржаўных моў. Засваенне правіл і прынцыпаў зносін, выпрацоўка стратэгій і тактык маўленчых паводзін. Фарміраванне ў навучэнцаў-білінгваў стратэгій самапрэзентацыі (стварэнне станоўчага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

іміджу), ветлівасці (просьба, парада, запрашэнне, прывітанне, развітанне, прабачэнне, удзячнасць, пахвала, камплімент). Навучанне тактоўнаму ўздзеянню на суразмоўцаў пры выкарыстанні стратэгій абвінавачвання, спрэчкі Выкарыстанне дыскусійных і сітуатыўных практыкаванняў, накіраваных на засваенне нацыянальна-спецыфічных мадэлей паводзін. Навучанне беларускай і рускай мовам, выхаванне маўленчай культуры асобы ў супрацоўніцтве.

**9. Фарміраванне лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі навучэнца-білінгва пры асваенні адукацыйных праграм па вучэбных прадметах “Русский язык”, “Беларуская мова”, “Литературное чтение”, “Літаратурнае чытанне”**

Змест лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі навучэнца пачатковых класаў на кожнай з дзвюх дзяржаўных моў. Фарміраванне бікультуральнасці навучэнца ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя. Лінгвакультурэма як адзінка навучання мове, якая знаходзіць сваё выражэнне ў мове і адлюстроўвае культуру і менталітэт народа. Факты сіметрыі і асіметрыі лінгвакультурэм рускай і беларускай моў. Структурныя тыпы лінгвакультурэм. Лінгвакультурэмы, выражаныя словам: безэквівалентная, фонавая і канататыўная лексіка. Фразеалагізмы як лінгвакультурэмы, якія маюць сінтаксічную форму словазлучэння. Лінгвакультурэмы, якія паўтараюць структуру сказа (прыказкі, прымаўкі, крылатыя выразы). Прэцэдэнтныя тэксты як структурны тып лінгвакультурэм. Зместавае напаўненне розных тыпаў лінгвакультурэм, якое знаходзіць адлюстраванне ў вучэбна-метадычных комплексах па вучэбных прадметах “Русский язык”, “Беларуская мова”, “Литературное чтение”, “Літаратурнае чытанне”. Сістэма працы з мастацкімі і навукова-папулярнымі тэкстамі лінгвакультуралагічнага характару, уключанымі ў змест вучэбных дапаможнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**
**(дзённая форма атрымання адукацыі)**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы заняткаў | Колькасць гадзін | | Самастойная работа | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| **1** | **Білінгвізм і білінгвальнасць. Унутраныя і знешнія фактары фарміравання білінгвізму (4 г.)** | **2** | **2** | | | |
| 1.1 | Білінгвальнасць як псіхалінгвістычная характарыстыка двухмоўнага індывіда. Якасная і колькасная характарыстыкі білінгвізму. | 2 | | | асн. [1], дадатк. [6], [7] | Апытванне |
| 1.2. | Унутраныя і знешнія фактары, што вызначаюць спецыфіку двухмоўя. | | 2 | | асн. [1], дадатк. [7] | Анкетаванне |
| **2** | **Тыпы дзіцячага білінгвізму. Асаблівасці дзіцячага білінгвізму ў Рэспубліцы Беларусь (4 г.)** | **4** | | | | |
| 2.1 | Крытэрыі выяўлення тыпаў дзіцячага білінгвізму: кампетэнцыя, камунікатыўная актыўнасць, форма мовы, узрост, спосаб і свядомасць фарміравання білінгвізму, этналінгвістычны крытэрый, прэстыжнасць і ступень роднасці моў, характар моўных кантактаў і характар ўзаемадзеяння моўных сістэм у свядомасці білінгва. | 2 | | | асн. [1], дадатк. [6], [7] | Апытванне |
| 2.2 | Асноўныя характарыстыкі білінгвізму малодшых | 2 | | 3 | асн. [1], | Анкетаванне |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | школьнікаў у Рэспубліцы Беларусь. | | | | дадатк. [2] | |
| **3** | **Прынцыпы і метады фарміравання дзіцячага білінгвізму (4 г.)** | **2** | **2** | | | |
| 3.1 | Прынцып “адзін чалавек – адна мова”. Лакальны прынцып. Тэмпаральны прынцып. Прадметна-тэматычны прынцып. Прынцып “пабочнага слухача”. Сумяшчэнне прынцыпаў. | 2 | | | асн. [1], дадатк. [6], [7] | Апытванне |
| 3.2 | Метады білінгвальнага выхавання. Бацькоўскія стратэгіі і стратэгіі дзяцей у засваенні моў. | | 2 | | асн. [1], дадатк. [7] | Анкетаванне |
| **4** | **Мадэлі моўнай асобы навучэнца пачатковых класаў ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя (4 г.)** | **4** | | | | |
| 4.1 | Разнастайнасць уяўленняў пра моўную асобу: мадэль сукупнай маўленчай дзейнасці групы асоб і моўны партрэт; калектыўная і індывідуальная моўная асоба; групавая моўная асоба; тыпавая і індывідуальная моўная асоба, білінгвальная асоба. Мадэляванне моўнай асобы ў псіхалінгвістыцы, сацыялінгвістыцы. Псіхалінгвістычная мадэль моўнай асобы Ю М. Караулава. Сацыялінгвістычная мадэль структуры моўнай асобы Л. П. Крысіна. | 2 | | | асн. [1], дадатк. [2], [6] | Апытванне |
| 4.2 | Мадэляванне моўнай асобы ў лінгвадыдактыцы. Лінгвадыдактычная мадэль моўнай асобы Г. І. Богіна. Абагульненая мадэль білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў. Моўны партрэт білінгвальнай асобы навучэнца. | 2 | | | асн. [1], дадатк. [2] | Апытванне |
| **5** | **Стратэгія фарміравання білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў ва ўмовах** | **4** | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | **блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя (4 г.)** | | | | | |
| 5.1 | Мэта моўнай адукацыі. Падыходы да выкладання мовы, прынцыпы, метады і сродкі фарміравання моўнай, маўленча-камунікатыўнай, сацыякультурнай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў на кожнай з дзвюх дзяржаўных моў. | 2 | | | асн. [1], дадатк. [3] | Апытванне |
| 5.2 | Сістэма вучэбна-пазнаваўчых задач, накіраваных на знаёмства навучэнцаў з моўнымі адзінкамі, асаблівасцямі іх функцыянавання ў маўленні, культурнай інфармацыяй, заключанай у іх. Сістэма вучэбна-практычных задач, накіраваных на выпрацоўку індывідуальных здольнасцей вучняў арыентавацца ва ўмовах зносін, планаваць маўленчую дзейнасць і кантраляваць развіццё камунікацыі. | 2 | | 3 | асн. [1], дадатк. [3] | Апытванне |
| **6** | **Фарміраванне моўнай кампетэнцыі навучэнца-білінгва пры асваенні адукацыйных праграм па вучэбных прадметах “Русский язык”, “Беларуская мова”, “Литературное чтение”, “Літаратурнае чытанне” (4 г.)** | | **4** | | | |
| 6.1. | Змест моўнай кампетэнцыі навучэнца пачатковых класаў на кожнай з дзвюх дзяржаўных моў. Засваенне дэкларатыўных ведаў. Выпрацоўка стратэгій авалодання другой мовай. | | 2 | | асн. [1], дадатк. [3] | Выкананне практычных заданняў |
| 6.2 | Адхіленні ад нормы ў маўленні білінгваў. Тыпы памылак у маўленні дзяцей-білінгваў. Шляхі вывучэння інтэрферэнцыі ў маўленні навучэнцаў-білінгваў. Праца па папярэджанні і выпраўленні інтэрферэнцыйных памылак | | 2 | 3 | асн. [1], дадатк. [6], [7] | Падбор дыдактычнага матэрыялу |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | навучэнцаў-білінгваў. | | | | | |
| **7** | **Фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнца-білінгва пры асваенні адукацыйных праграм па вучэбных прадметах “Русский язык”, “Беларуская мова”, “Литературное чтение”, “Літаратурнае чытанне” (4 г.)** | | **4** | | | |
| 7.1 | Змест маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнца пачатковых класаў на кожнай з дзвюх дзяржаўных моў. Выпрацоўка стратэгій карыстання мовай пры гаварэнні, пры ўспрыманні і разуменні паведамлення падчас слухання і чытання. Асваенне навучэнцамі пачатковых класаў механізму стварэння пісьмовага тэксту. | | 2 | | асн. [1], дадатк. [3] | Выкананне практычных заданняў |
| 7.2 | Сістэма камунікатыўных практыкаванняў для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампе-тэнцыі навучэнца-білінгва. | | 2 | 3 | асн. [1], дадатк. [3] | Падбор дыдактычнага матэрыялу |
| **8** | **Фарміраванне сацыякультурнай кампетэнцыі навучэнца-білінгва пры асваенні адукацыйных праграм па вучэбных прадметах “Русский язык”, “Беларуская мова”, “Литературное чтение”,“Літаратурнае чытанне” (4 г.)** | | **4** | | | |
| 8.1 | Змест сацыякультурнай кампетэнцыі навучэнца пачатковых класаў на кожнай з дзвюх дзяржаўных моў. Засваенне правіл і прынцыпаў зносін, выпрацоўка стратэгій і тактык маўленчых паводзін. Фарміраванне ў навучэнцаў-білінгваў стратэгій самапрэзентацыі, ветлівасці. | | 2 | | асн. [1], дадатк. [3] | Выкананне практычных заданняў |
| 8.2. | Навучанне тактоўнаму ўздзеянню на суразмоўцаў пры выкарыстанні стратэгій абвінавачвання, спрэчкі. | | 2 | 3 | асн. [1], дадатк. [3] | Падбор дыдактычнага матэрыялу |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Выкарыстанне дыскусійных і сітуатыўных практыкаванняў, накіраваных на засваенне нацыянальна-спецыфічных мадэлей паводзін. Выхаванне маўленчай культуры асобы ў супрацоўніцтве. | | | | | |
| **9** | **Фарміраванне лінгвакультуралагічнай кам-петэнцыі навучэнца-білінгва пры асваенні адукацыйных праграм па вучэбных прадметах “Русский язык”, “Беларуская мова”, “Литературное чтение”, “Літаратурнае чытанне” (4 г.)** | | **4** | | | |
| 9.1 | Змест лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі навучэнца пачатковых класаў на кожнай з дзвюх дзяржаўных моў. Фарміраванне бікульту-ральнасці навучэнца. Лінгвакультурэма як адзінка навучання мове, якая знаходзіць сваё выражэнне ў мове і адлюстроўвае культуру і менталітэт народа. Факты сіметрыі і асіметрыі лінгвакультурэм рускай і беларускай моў. Структурныя тыпы лінгвакультурэм. | | 2 | | асн. [1], дадатк. [3], [4], [5] | Выкананне практычных заданняў |
| 9.2 | Зместавае напаўненне розных тыпаў лінгвакультурэм, якое знаходзіць адлюстраванне ў вучэбна-метадычных комплексах па вучэбных прадметах “Русский язык”, “Беларуская мова”, “Литературное чтение”, “Літаратурнае чытанне”. Сістэма працы з мастацкімі і навукова-папулярнымі тэкстамі лінгвакультуралагічнага характару, уключанымі ў змест вучэбных дапаможнікаў. | | 2 | 3 | асн. [1], дадатк. [3], [4], [5] | Падбор дыдактычнага матэрыялу |
| | ***Усяго*** | ***16*** | ***20*** | ***18*** | | **экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## (завочная форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы заняткаў | Колькасць гадзін | | Самастойная работа | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| **1** | **Білінгвізм і білінгвальнасць. Унутраныя і знешнія фактары фарміравання білінгвізму (4 г.)** | **2** | | **2** | | |
| 1.1 | Білінгвальнасць як псіхалінгвістычная характарыстыка двухмоўнага індывіда. Якасная і колькасная характарыстыкі білінгвізму. | 2 | | | асн. [1], дадатк. [6], [7] | Апытванне |
| 1.2. | Унутраныя і знешнія фактары, што вызначаюць спецыфіку двухмоўя. | | | 2 | асн. [1], дадатк. [7] | Анкетаванне |
| **2** | **Тыпы дзіцячага білінгвізму. Асаблівасці дзіцячага білінгвізму ў Рэспубліцы Беларусь (4 г.)** | | | **7** | | |
| 2.1 | Крытэрыі выяўлення тыпаў дзіцячага білінгвізму: кампетэнцыя, камунікатыўная актыўнасць, форма мовы, узрост, спосаб і свядомасць фарміравання білінгвізму, этналінгвістычны крытэрый, прэстыжнасць і ступень роднасці моў, характар моўных кантактаў і характар ўзаемадзеяння моўных сістэм у свядомасці білінгва. | | | 2 | асн. [1], дадатк. [6], [7] | Апытванне |
| 2.2 | Асноўныя характарыстыкі білінгвізму малодшых | | | 5 | асн. [1], | Анкетаванне |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | школьнікаў у Рэспубліцы Беларусь. | | | | дадатк. [2] | |
| **3** | **Прынцыпы і метады фарміравання дзіцячага білінгвізму (4 г.)** | | | **4** | | |
| 3.1 | Прынцып “адзін чалавек – адна мова”. Лакальны прынцып. Тэмпаральны прынцып. Прадметна-тэматычны прынцып. Прынцып “пабочнага слухача”. Сумяшчэнне прынцыпаў. | | | 2 | асн. [1], дадатк. [6], [7] | Апытванне |
| 3.2 | Метады білінгвальнага выхавання. Бацькоўскія стратэгіі і стратэгіі дзяцей у засваенні моў. | | | 2 | асн. [1], дадатк. [7] | Анкетаванне |
| **4** | **Мадэлі моўнай асобы навучэнца пачатковых класаў ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя (4 г.)** | | **2** | **2** | | |
| 4.1 | Разнастайнасць уяўленняў пра моўную асобу: мадэль сукупнай маўленчай дзейнасці групы асоб і моўны партрэт; калектыўная і індывідуальная моўная асоба; групавая моўная асоба; тыпавая і індывідуальная моўная асоба, білінгвальная асоба. Мадэляванне моўнай асобы ў псіхалінгвістыцы, сацыялінгвістыцы. Псіхалінгвістычная мадэль моўнай асобы Ю М. Караулава. Сацыялінгвістычная мадэль структуры моўнай асобы Л. П. Крысіна. | | | 2 | асн. [1], дадатк. [2], [6] | Апытванне |
| 4.2 | Мадэляванне моўнай асобы ў лінгвадыдактыцы. Лінгвадыдактычная мадэль моўнай асобы Г. І. Богіна. Абагульненая мадэль білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў. Моўны партрэт білінгвальнай асобы навучэнца. | | 2 | | асн. [1], дадатк. [2] | Апытванне |
| **5** | **Стратэгія фарміравання білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў ва ўмовах** | **2** | | **5** | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | **блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя (4 г.)** | | | | | |
| 5.1 | Мэта моўнай адукацыі. Падыходы да выкладання мовы, прынцыпы, метады і сродкі фарміравання моўнай, маўленча-камунікатыўнай, сацыякультурнай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў на кожнай з дзвюх дзяржаўных моў. | 2 | | | асн. [1], дадатк. [3] | Апытванне |
| 5.2 | Сістэма вучэбна-пазнаваўчых задач, накіраваных на знаёмства навучэнцаў з моўнымі адзінкамі, асаблівасцямі іх функцыянавання ў маўленні, культурнай інфармацыяй, заключанай у іх. Сістэма вучэбна-практычных задач, накіраваных на выпрацоўку індывідуальных здольнасцей вучняў арыентавацца ва ўмовах зносін, планаваць маўленчую дзейнасць і кантраляваць развіццё камунікацыі. | | | 5 | асн. [1], дадатк. [3] | Апытванне |
| **6** | **Фарміраванне моўнай кампетэнцыі навучэнца-білінгва пры асваенні адукацыйных праграм па вучэбных прадметах “Русский язык”, “Беларуская мова”, “Литературное чтение”, “Літаратурнае чытанне” (4 г.)** | | **2** | **5** | | |
| 6.1. | Змест моўнай кампетэнцыі навучэнца пачатковых класаў на кожнай з дзвюх дзяржаўных моў. Засваенне дэкларатыўных ведаў. Выпрацоўка стратэгій авалодання другой мовай. | | 2 | | асн. [1], дадатк. [3] | Выкананне практычных заданняў |
| 6.2 | Адхіленні ад нормы ў маўленні білінгваў. Тыпы памылак у маўленні дзяцей-білінгваў. Шляхі вывучэння інтэрферэнцыі ў маўленні навучэнцаў-білінгваў. Праца па папярэджанні і выпраўленні інтэрферэнцыйных памылак | | | 5 | асн. [1], дадатк. [6], [7] | Падбор дыдактычнага матэрыялу |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | навучэнцаў-білінгваў. | | | | | |
| **7** | **Фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнца-білінгва пры асваенні адукацыйных праграм па вучэбных прадметах “Русский язык”, “Беларуская мова”, “Литературное чтение”, “Літаратурнае чытанне” (4 г.)** | | | **7** | | |
| 7.1 | Змест маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнца пачатковых класаў на кожнай з дзвюх дзяржаўных моў. Выпрацоўка стратэгій карыстання мовай пры гаварэнні, пры ўспрыманні і разуменні паведамлення падчас слухання і чытання. Асваенне навучэнцамі пачатковых класаў механізму стварэння пісьмовага тэксту. | | | 2 | асн. [1], дадатк. [3] | Выкананне практычных заданняў |
| 7.2 | Сістэма камунікатыўных практыкаванняў для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнца-білінгва. | | | 5 | асн. [1], дадатк. [3] | Падбор дыдактычнага матэрыялу |
| **8** | **Фарміраванне сацыякультурнай кампетэнцыі навучэнца-білінгва пры асваенні адука-цыйных праграм па вучэбных прадметах “Русский язык”, “Беларуская мова”, “Литературное чтение”,“Літаратурнае чытанне” (4 г.)** | | | **7** | | |
| 8.1 | Змест сацыякультурнай кампетэнцыі навучэнца пачатковых класаў на кожнай з дзвюх дзяржаўных моў. Засваенне правіл і прынцыпаў зносін, выпрацоўка стратэгій і тактык маўленчых паводзін. Фарміраванне ў навучэнцаў-білінгваў стратэгій самапрэзентацыі, ветлівасці. | | | 2 | асн. [1], дадатк. [3] | Выкананне практычных заданняў |
| 8.2. | Навучанне тактоўнаму ўздзеянню на суразмоўцаў пры выкарыстанні стратэгій абвінавачвання, спрэчкі. | | | 5 | асн. [1], дадатк. [3] | Падбор дыдактычнага матэрыялу |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Выкарыстанне дыскусійных і сітуатыўных практыкаванняў, накіраваных на засваенне нацыянальна-спецыфічных мадэлей паводзін. Выхаванне маўленчай культуры асобы ў супрацоўніцтве. | | | | | |
| **9** | **Фарміраванне лінгвакультуралагічнай кам-петэнцыі навучэнца-білінгва пры асваенні адукацыйных праграм па вучэбных прадметах “Русский язык”, “Беларуская мова”, “Литературное чтение”, “Літаратурнае чытанне” (4 г.)** | | | **7** | | |
| 9.1 | Змест лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі навучэнца пачатковых класаў на кожнай з дзвюх дзяржаўных моў. Фарміраванне бікультуральнасці навучэнца. Лінгвакультурэма як адзінка навучання мове, якая знаходзіць сваё выражэнне ў мове і адлюстроўвае культуру і менталітэт народа. Факты сіметрыі і асіметрыі лінгвакультурэм рускай і беларускай моў. Структурныя тыпы лінгвакультурэм. | | | 2 | асн. [1], дадатк. [3], [4], [5] | Выкананне практычных заданняў |
| 9.2 | Зместавае напаўненне розных тыпаў лінгвакультурэм, якое знаходзіць адлюстраванне ў вучэбна-метадычных комплексах па вучэбных прадметах “Русский язык”, “Беларуская мова”, “Литературное чтение”, “Літаратурнае чытанне”. Сістэма працы з мастацкімі і навукова-папулярнымі тэкстамі лінгвакультуралагічнага характару, уключанымі ў змест вучэбных дапаможнікаў. | | | 5 | асн. [1], дадатк. [3], [4], [5] | Падбор дыдактычнага матэрыялу |
| | ***Усяго*** | ***4*** | ***4*** | ***46*** | | **экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

### *Асноўная*

1. Двуязычие: теория и практика / А. А. Гируцкий [и др.] ; под ред. А. А. Гируцкого. – Минск : Белорус. гос. пед. ун-т, 2012. – 159 с.

### *Дадатковая*

2. Свірыдзенка, В. І. Тэарэтычныя асновы фарміравання маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца / В. І. Свірыдзенка // Адукацыя і выхаванне. – 2019. - № 3. – С. 63–68.

3. Свірыдзенка, В. І. Стратэгія фарміравання маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў/ В. І. Свірыдзенка // Весці БДПУ. – Сер. 1. Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2019. – № 1. – С. 10–14.

4. Свириденко О. И. Организация работы с фразеологизмами как способ формирования лингвокультурологической компетенции учащихся-билингвов // Коммуникативные позиции русского языка в славянском пограничье: двуязычие и межъязыковая интерференция : науч. доклады участников Междунар. форума русистов, г. Новозыбков, Брян. обл., 24–26 мая 2018 г. / Брян. гос. ун-т ; под ред. С. Н. Стародубец, В. Н. Пустовойтова. – Брянск, 2018. – С. 429–434.

5. Свириденко, О. И. Организация работы с межъязыковыми омонимами как способ формирования лингвокультурологической компетенции учащихся-билингвов / О. И. Свириденко // Семантика языковых единиц в разных типах речи : сб. ст. междунар. науч. конф. / Ярослав. гос. пед. ун-т ; под науч. ред. Е. Н. Лагузовой. – Ярославль, 2019. – С. 169–175.

6. Цейтлин, С. Н. Освоение языка ребёнком в ситуации двуязычия / С. Н. Цейтлин, Г. Н. Чиршева, Т. В. Кузьмина. – СПб. : Златоуст, 2014. – 140 с.

7. Чиршева, Г. Н. Детский билингвизм: одновременное усвоение двух языков / Г. Н. Чиршева. – СПб. : Златоуст, 2012. – 488 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ДРУГОЙ СТУПЕНІ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

Мэтай самастойнай работы студэнтаў другой ступені вышэйшай адукацыі з'яўляецца авалоданне ведамі, уменнямі і навыкамі развіцця білінгвальнай моўнай асобы малодшага школьніка, вопытам творчай і даследчай дзейнасці. Самастойная работа студэнтаў II ступені вышэйшай адукацыі спрыяе развіццю самастойнасці, адказнасці і арганізаванасці, творчага падыходу да рашэння праблем вучэбнага і прафесійнага ўзроўню.

Асноўнымі відамі самастойнай работы студэнтаў II ступені вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне "Мадэлі фарміравання білінгвальнай моўнай асобы малодшага школьніка" з'яўляюцца:

- засваенне тэарэтычнага матэрыялу на базе канспектаў лекцый і рэкамендаванай вучэбнай літаратуры,
- падрыхтоўка да практычных заняткаў,
- выкананне дамашніх заданняў,
- падрыхтоўка вусных паведамленняў,
- распрацоўка анкет, анкетаванне навучэнцаў і іх бацькоў,
- падбор дыдактычнага матэрыялу да ўрокаў,
- распрацоўка фрагментаў урокаў.

Выконваючы самастойную работу, студэнт II ступені вышэйшай адукацыі павінен:

- засвоіць матэрыял, які выносіцца на самастойную работу і прапанаваны па вучэбнай дысцыпліне "Мадэлі фарміравання білінгвальнай моўнай асобы малодшага школьніка",
- здзяйсняць самастойную работу ў арганізацыйных формах, прадугледжаных вучэбнай праграмай,
- выконваць самастойную работу ў адпаведнасці з графікам, відамі і тэрмінамі, вызначанымі выкладчыкам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Патрабаванні да выканання самастойнай работы студэнтаў II ступені вышэйшай адукацыі дзённай формы атрымання адукацыі**

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | Колькасць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Асноўныя характарыстыкі білінгвізму малодшых школьнікаў у Рэспубліцы Беларусь | 3 | Вылучэнне асноўных характарыстык білінгвізму навучэнцаў 1 (2, 3 або 4) класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай або рускай мовамі навучання. | Распрацоўка анкет. Аналіз вынікаў анкетавання навучэнцаў пачатковых класаў |
| 2. | Сістэма вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач | 3 | Распрацоўка вучэбна-практычных задач, накіраваных на выпрацоўку ў вучняў 2 (3 або 4) класа здольнасцей арыентавацца ва ўмовах зносін, планаваць маўленчую дзейнасць і кантраляваць развіццё камунікацыі. | Парыхтоўка і правядзенне фрагмента ўрока з выкарыстаннем распрацаваных вучэбна-практычных задач |
| 3. | Шляхі вывучэння інтэрферэнцыі ў маўленні навучэнцаў-білінгваў. Праца па папярэджанні і выпраўленні інтэрферэнцыйных памылак | 3 | Распрацоўка практыкаванняў, накіраваных на папярэджанне і выпраўленне інтэрферэнцыйных памылак навучэнцаў 2 (3 або 4) класа. | Парыхтоўка і правядзенне фрагмента ўрока з выкарыстаннем распрацаваных практыкаванняў |
| 4. | Сістэма камунікатыўных практыкаванняў для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнца-білінгва. | 3 | Падбор камунікатыўных практыкаванняў для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнцаў 2 (3 або 4) класа пры вывучэнні раздзела “Сказ”. | Парыхтоўка і правядзенне фрагмента ўрока з выкарыстаннем падабраных практыкаванняў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 5. | Навучанне тактоўнаму ўздзеянню на суразмоўцаў пры выкарыстанні стратэгій абвінавачвання, спрэчкі. | 3 | Распрацоўка дыскусійных практыкаванняў, накіраваных на выпрацоўку ў навучэнцаў стратэгій абвінавачвання, спрэчкі. | Парыхтоўка і правядзенне фрагмента ўрока з выкарыстаннем распрацаваных практыкаванняў |
| 6. | Сістэма працы з мастацкімі і навукова-папулярнымі тэкстамі лінгвакультуралагічнага характару | 3 | Сэнсавы аналіз мастацкага або навукова-папулярнага тэксту лінгвакультуралагічнага характару | Распрацоўка сістэмы пытанняў па тэксце |
| 7. | Падрыхтоўка да экзамену | 36 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Патрабаванні да выканання самастойнай работы студэнтаў II ступені вышэйшай адукацыі завочнай формы атрымання адукацыі**

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | Колькасць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Унутраныя і знешнія фактары, што вызначаюць спецыфіку двухмоўя | 2 | Вылучэнне ўнутраных і знешніх фактараў, якія вызначаюць спецыфіку білінгвізму, у працы з навучэнцамі 1 (2, 3 або 4) класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай або рускай мовамі навучання. | Распрацоўка анкет. Аналіз вынікаў анкетавання навучэнцаў пачатковых класаў |
| 2. | Крытэрыі выяўлення тыпаў дзіцячага білінгвізму | 2 | Складанне характарыстык розных тыпаў дзіцячага білінгвізму | Сістэматызацыя тэарэтычнага матэрыялу |
| 3. | Асноўныя характарыстыкі білінгвізму малодшых школьнікаў у Рэспубліцы Беларусь | 5 | Вылучэнне асноўных характарыстык білінгвізму навучэнцаў 1 (2, 3 або 4) класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай або рускай мовамі навучання | Распрацоўка анкет. Аналіз вынікаў анкетавання навучэнцаў пачатковых класаў |
| 4. | Прынцыпы і метады фарміравання дзіцячага білінгвізму | 4 | Класіфікацыя прынцыпаў і метадаў фарміравання дзіцячага двухмоўя | Сістэматызацыя тэарэтычнага матэрыялу |
| 5. | Разнастайнасць уяўленняў пра моўную асобу | 2 | Характарыстыка розных мадэлей моўнай асобы | Сістэматызацыя тэарэтычнага матэрыялу |
| 6. | Сістэма вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач | 5 | Распрацоўка вучэбна-практычных задач, накіраваных на выпрацоўку ў вучняў 2 (3 або 4) класа здольнасцей арыентавацца ва ўмовах зносін, планаваць | Парыхтоўка і правядзенне фрагмента ўрока з выкарыстаннем распрацаваных вучэбна- |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | маўленчую дзейнасць і кантраляваць развіццё камунікацыі. | практычных задач |
| 7. | Шляхі вывучэння інтэрферэнцыі ў маўленні навучэнцаў-білінгваў. Праца па папярэджанні і выпраўленні інтэрферэнцыйных памылак | 5 | Распрацоўка практыкаванняў, накіраваных на папярэджанне і выпраўленне інтэрферэнцыйных памылак навучэнцаў 2 (3 або 4) класа. | Парыхтоўка і правядзенне фрагмента ўрока з выкарыстаннем распрацаваных практыкаванняў |
| 8. | Выпрацоўка стратэгій карыстання мовай | 2 | Падбор практыкаванняў для выпрацоўкі ў навучэнцаў стратэгій карыстання другой мовай пры гаварэнні, пры ўспрыманні і разуменні паведамлення падчас слухання, чытання. | Парыхтоўка і правядзенне фрагмента ўрока з выкарыстаннем падабраных практыкаванняў |
| 9. | Сістэма камунікатыўных практыкаванняў для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнца-білінгва. | 5 | Падбор камунікатыўных практыкаванняў для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнцаў 2 (3 або 4) класа пры вывучэнні раздзела “Сказ”. | Парыхтоўка і правядзенне фрагмента ўрока з выкарыстаннем падабраных практыкаванняў |
| 10. | Засваенне правіл і прынцыпаў зносін, выпрацоўка стратэгій і тактык маўленчых паводзін. | 2 | Распрацоўка сітуатыўных практыкаванняў, накіраваных на выпрацоўку ў навучэнцаў стратэгій і тактык маўленчых паводзін. | Парыхтоўка і правядзенне фрагмента ўрока з выкарыстаннем распрацаваных практыкаванняў |
| 12. | Навучанне тактоўнаму ўздзеянню на суразмоўцаў пры выкарыстанні стратэгій абві- | 5 | Распрацоўка дыскусійных практыкаванняў, накіраваных на выпрацоўку ў навучэнцаў стратэгій абвінавачвання, спрэчкі. | Парыхтоўка і правядзенне фрагмента ўрока з выкарыстаннем распрацаваных прак- |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | навачвання, спрэчкі. | | | тыкаванняў |
| 13. | Лінгвакультурэма як адзінка навучання мове, якая знаходзіць сваё выражэнне ў мове і адлюстроўвае культуру і менталітэт народа. | 2 | Аналіз зместу вучэбных дапаможнікаў з мэтай вылучэння прадстаўленых у іх лінгвакультурэм | Складанне канспекта |
| 14. | Сістэма працы з мастацкімі і навукова-папулярнымі тэкстамі лінгвакультуралагічнага характару | 5 | Сэнсавы аналіз мастацкага або навукова-папулярнага тэксту лінгвакультуралагічнага характару | Распрацоўка сістэмы пытанняў па тэксце |
| 7. | Падрыхтоўка да экзамену | 36 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Рэкамендацыі па кантролі якасці засваення ведаў

Комплексныя праблемныя сітуацыі, актуальныя кампетэнтнасныя задачы з'яўляюцца эфектыўнымі сродкамі развіцця і дыягностыкі кампетэнцый студэнтаў. Таму для дыягностыкі сфарміраванасці кампетэнцый студэнтаў могуць быць выкарыстаны наступныя формы і сродкі: вырашэнне праблемных сітуацый, рашэнне кампетэнтнасных задач, выкананне практычных, творчых заданняў і прэзентацыя атрыманых вынікаў, удзел у дзелавой (ролевай, імітацыйнай) гульні, выкананне і абарона праектаў, партфоліа, рэйтынгавая ацэнка ведаў і інш.

Працэдура дыягностыкі сфарміраванасці кампетэнцый студэнта складаецца з наступных этапаў: вызначэнне аб'екта дыягностыкі; выяўленне факта вучэбных дасягненняў студэнта з дапамогай крытырэяльна-арыентаваных тэстаў і іншых сродкаў дыягоностыкі; вымярэнне і ацэньванне (з дапамогай шкалы ацэнак) ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарта.

Для ацэнкі вучэбных дасягненняў студэнтаў выкарыстоўваюцца крытэрыі, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, установай вышэйшай адукацыі:

Об утверждении правил проведения аттестации студентов, курсантов, слушателей при освоении содержания образовательных программ высшего образования : Пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 53 ад 29.05.2012.

Критерии оценки результатов учебной деятельности обучающихся в учреждениях высшего образования по десятибалльной шкале : інфармацыйнае пісьмо Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 09-10/53-ПО ад 28.05.2013.

Положение о порядке проведения текущей аттестации студентов : зацверджана рэктарам БДПУ № 09-40/3 от 25.11.2013.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пратакол узгаднення вучэбнай праграмы

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб змяненнях у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму |
|---|---|---|---|
| “Праектаванне інавацыйнага адукацыйнага асяроддзя” | кафедра педагогікі і псіхалогіі пачатковай адукацыі | Змест праграм узгоднены на стадыі распрацоўкі | Пратакол № 11 ад 20.04.2019 |
| “Праектаване адаптыўнага адукацыйнага асяроддзя / Праектаванне полікультурнага адукацыйнага асяроддзя” | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ